Зараз Віцебск – гэта горад, у якім незвычайна гарманічна спалучаюцца традыцыі мінулых эпох і модныя павевы дня сённяшняга. Кожны куток Віцебска прасякнуты духам гісторыі, дыхае жыццём, выпраменьваючы адчуванне цяпла. А ўсё таму, што гісторыя горада Віцебска багатая на падзеі. Сярод іх знайшлося месца як трагічным, так і радасным момантам. Усё гэта ў выніку падахвочвала горад да развіцця і ўдасканалення. Як вынік – сёння Віцебск ганарыцца сваімі ўнікальнымі архітэктурнымі ансамблямі, помнікамі і проста гісторыяй.



Малюнак 2 – Віцебскі амфітэатр

УДК 821.161.3

## ВАЙНА Ў ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ІВАНА МЕЛЕЖА

*Студэнт – Маскалёнак А.С., 5 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны ў жыцці і творчасці Швана Мележа.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, тэма Вялікай Айчыннай вайны, гераізм, гісторыя.

Шмат часу прайшло з моманту завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, зыходзіць пакаленне, якое памятае жахі гэтай страшэннай трагедыі нашага народу. Але і сёння людзі памятаюць пра вайну. Яна прайшла праз кожную хату, кватэру, праз кожную сям'ю.

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў нашу гісторыю як небывалая па жорсткасці, трагізму і гераізму барацьба народаў супраць гітлераўскага

фашызму. Шлях да Перамогі быў доўгім і цяжкім. Цікавасць да падзей тых гадоў, да асмыслення наступстваў і ўрокаў вайны не слабее і сёння.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адной з важнейшых у беларускай літаратуры. Да тэмы вайны звярталіся і звяртаюцца пісьменнікі як старэйшага, так і малодшага пакаленняў.

Значнай падзеяй у літаратуры, і наогул у культурным жыцці БССР, стаў раман Івана Мележа «Мінскі напрамак». Гэты раман стаў шырокай панарамнай карцінай бітвы за Савецкую Беларусь, дзе паказваецца фронт і партызанскі тыл, жыццё і подзвіг людзей, суровая і бязлітасная вайна ў розных складаных сітуацыях. Такі паказ вайны заклаў традыцыі пазнейшай літаратуры.

Іван Мележ – беларускі пісьменнік і публіцыст, лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій, удзельнік ваенных дзеянняў у Вялікай Айчыннай вайне. У свой час быў прадстаўлены да двух ордэнам. Пасля смерці пакінуў нашчадкам вялікую літаратурную спадчыну.

Іван Мележ быў надзвычай сціплым чалавекам, сарамлівым. Умеў і любіў выслухаць суразмоўцу, не перабіваю яго нават тады, калі быў нязгодны. Сам жа Іван Паўлавіч казаў спакойна, стрымана, разважліва, нібы ўзважваючы кожнае слова, кожную сваю думку. І гэта было зразумела: ён ведаў сапраўдную цану слова. Іван Мележ нарадзіўся 8 лютага 1921 года ў вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна, у самай глыбіні беларускага Палесся. Адтуль, з народных глыбінь, выйшлі ў свет і пайшлі ў літаратурную неўміручасць і героі Івана Паўлавіча: менавіта там ён вывучаў іх характары, рабіў абагульненні чалавечых рыс, паводзін, характараў... Вёска ў мірным стваральным жыцці, родныя мясціны і вайна, лёс асобнага чалавека і народа ў цэлым падчас суровых, смяротна небяспечных, выпрабаванняў – гэта і былі асноўныя тэмы глыбіннай, таленавітай і непаўторнай даследчай працы Мележа-літаратара, Мележа-творцы. Суровыя і жорсткія выпрабаванні прыйшлося выпрабаваць і самому Івану Мележу... Адразу ж пасля заканчэння мясцовай дзесяцігодкі 17-гадовага юнака запрасілі на працу ў Хойніцкі раённы камітэт камсамола. У наступным, 1939 годзе, Іван паступае ў надзвычай прэстыжную вышэйшую навучальную ўстанову – Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. Тады ж ён пачаў выступаць у друку з вершамі. Адным з першых сярод іх стаў верш «Радзіме», апублікаваны ў лютым 1939-га ў «Чырвонай змене». Здавалася, наперадзе такое цікавае, багатае і насычанае падзеямі жыццё! Аднак лёс распарадзіўся па-іншаму... Ужо з першага курса Маскоўскага інстытута Мележа заклікаюць у Чырвоную Армію, а летам 1940-га ён прымае першае баявое хрышчэнне – удзельнічае ў вызваленні Паўночнай Букавіны.

**У шэрагах савецкай арміі.**

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ён на фронце. Баі з вялізнымі, непапраўнымі стратамі баявых сяброў пад Уманню, Нікалаевым, Растовам-на-Доне, Лазовой. Варожая куля не праходзіць і міма Івана: у чэрвені 1942 г. ён атрымлівае цяжкае раненне. Лячэнне ў шпіталі ў Тбілісі, і Камісія прызнае яго «непрыдатным да страявой службы».

**Жыццё пасля ранення**

Івана Мележа накіроўваюць у тыл: спачатку ў Бугуруслан, потым – у Малдову, дзе ў Педагагічным інстытуце ён выкладае ваенную падрыхтоўку. Знясілены, але магутны арганізм, душа і характар маладога чалавека прагнуць ведаў, і шчасце, нарэшце, усміхаецца яму: у 1943-м Івана пераводзяць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, які знаходзіўся тады на падмаскоўнай станцыі Сходня. Працу тым жа выкладчыкам ваеннай падрыхтоўкі ён спалучае з вучобай на завочным аддзяленні філалагічнага факультэта БДУ, пасля перакладаецца на стацыянар і ўжо ў вызваленым Мінску атрымлівае дыплом аб вышэйшай адукацыі. Прага ведаў, аднак, не змяншаецца: Іван Паўлавіч паступае ў аспірантуру і пачынае выкладаць родную беларускую літаратуру там жа, у родным універсітэце. Тады і зрабіў ён першую сур'ёзную заяўку ў мастацкай прозе – сваімі апавяданнямі і аповесцямі, эсэ і нарысамі.

**Творчасць**

Друкавацца Іван Мележ пачаў з 1939 года, калі быў апублікаваны яго першы верш. Пасля першага ранення, знаходзячыся ў Тбіліскім шпіталі, пачынае пісаць прозу, а адразу пасля вайны выпускае першы зборнік апавяданняў і спрабуе сябе ў драматургіі. Першы празаічны твор, апавяданне «Сустрэча ў шпіталі», быў напісаны, калі сам аўтар ляжаў у шпіталі, і апублікаваны ў 1943 г. Першыя апавяданні, звычайна не даўжэй за 10 старонак, атрымалі пахвалу Кузьмы Чорнага, і гэта стала для маладога пісьменніка не толькі прыемнай весткай, але і вялікім стымулам. Дзеянне ў апавяданнях адбывалася ў ваенны час, нярэдка ў шпіталі, як у «Сустрэчы ў шпіталі» (пазней перайменаванай у «Сустрэчу») і «Апошняй аперацыі» (1945). Гэтыя апавяданні з простымі характарамі, матывам і стылем былі спробай пяра маладога аўтара, але нягледзячы на гэта яны давалі пэўны намёк на глыбокі псіхалагізм ягоных пазнейшых больш спелых твораў. У апавяданні «Канец размовы» (1945) нямецкі яфрэйтар прымушае старога машыніста весці нямецкі ваенны цягнік; нежаданне машыніста быць ані героем, ані здраднікам добра схоплена аўтарам і перададзена ў наступных словах: «З набліжэннем станцыі старога машыніста пакідалі апошнія супакойлівыя думкі і падымалася прыкрасць да сябе. Згадалася, як Валя ўгаворвала пусціць паравоз пад адхон, – згадалася з нямым цяжкім папрокам. «Трэба быць героем, каб не быць здраднікам... Сярэдзіны няма...» – успомніліся яму словы Валі, і ён падумаў, што ў іх была суровая праўда. Ён не мог быць героем. Ён адчуваў, што не здолен нічога гераічнага зрабіць, не здолен задушыць няпэўнасці, разгубленасці, якія прымушалі падпарадкоўвацца ненавіснаму гітлераўцу і весці эшалон наперакор свайму жаданню. Але ён не хацеў быць нягоднікам. З адчуваннем непапраўнага няшчасця, якое павінна давяршыцца, змучаны доўгай дарогаю і думкамі, стары падводзіў эшалон да станцыі». Аднак у гэты момант пачалася атака савецкай авіяцыі і стары рашыўся на адкрыты супраціў гітлераўцу, што

хацеў прымусіць яго даць задні ход. Ён быў застрэлены якраз тады, калі савецкія войскі рыхтаваліся да атакі эшалона.

Адным з найлепшых твораў першага празаічнага зборніка Мележа было апавяданне «У завіруху», якое дало назву ўсёй кнізе. Заснаванае на ўласным вопыце аўтара, яно апісвае жудаснае падарожжа маладога салдата Засмужца, які атрымаў заданне ў лютую завіруху даставіць пакет ад галоўнакамандуючага камандзіру кавалерыйскай брыгады. Апавяданне ў яркіх фарбах малюе боль і зняможанне, якія салдат перамагае толькі таму, што ўсведамляе важнасць задання. Чытачу перадаецца пачуццё бязмежнай стомленасці і слабасці героя, але як толькі ён трохі ўзнаўляе свае сілы, то атрымлівае іншае заданне, што падаецца проста невыканальным, і салдат спрабуе ўхіліцца, аднак чалавек, які павінен ісці замест яго, забіты. Заступіўшы на месца забітага, Засмужэц адчувае невядомае дасюль пачуццё салідарнасці і выпраўляецца на сваё новае заданне: «Больш Засмужэц не азіраўся. Уперадзе зноў ляжала далёкая цяжкая дарога. Не змаўкаючы, гула завіруха».

**«Мінскі напрамак»**

У 1947–1952 гг. Іван Паўлавіч Мележ напісаў раман «Мінскі напрамак», у якім паказаў вызваленне Беларусі воінамі Чырвонай Арміі і партызанамі ў красавіку – ліпені 1944 г. Раман прысвечаны заключнаму этапу Вялікай Айчыннай вайны – вызваленню Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Аўтар паставіў задачу ва ўсіх фарбах паказаць бітву за Радзіму: і на франтавых дарогах, і ў варожым тыле. Пісьменнік намаляваў у рамане цэлую галерэю вобразаў, гатовых ахвяраваць уласным жыццём дзеля вольнага жыцця.

Сам Мележ падкрэсліваў тыповасць гэтага рамана, калі ў 1970 г. пісаў пра сваю творчасць у часопісе «Вопросы литературы»: «Раман гэты многімі рысамі падобны да другіх раманаў пра вайну, што ствараліся ў тыя самыя гады. Ён шырокі і па складу дзеючых асобаў, і па ахопу падзей. Яго асноўная танальнасць – гераічная. Гэта кніга пра нашу перамогу ў Беларусі, пра вызваленчую барацьбу за беларускую зямлю ў 1944 годзе. Гэта кніга – пра велічнасць народнага подзвігу. З гэтай тэмай пераплятаюцца і маральныя праблемы, але яны маюць другаснае значэнне. Я імкнуўся ўсё падпарадкаваць асноўнай задачы – стварыць вобраз народа ў цяжкі, аднак адметны час. Гэтае імкненне ўсебакова паказаць змаганне людзей і прымусіла ўвесці ў кнігу мноства персанажаў, вызначыла яе сюжэтную і кампазіцыйную пабудову, яе панарамнасць».

Яшчэ пры жыцці (а пражыў Мележ, на вялікі жаль, так мала – усяго толькі 55 гадоў!) Яго творы былі названыя адным, такім «высокім» і, адначасова, заслужаным ім словам – класіка! «Палескую хроніку» Івана Паўлавіча ставілі ў адзін шэраг з «Ціхім Донам» Міхаіла Шолахава, а некаторыя і вышэй.

Творы Івана Мележа забяспечылі яму неўміручасць. Яго імем названы вуліцы ў некалькіх гарадах Беларусі. Імя пісьменніка прысвоена сярэдняй школе на яго радзіме, бібліятэцы і гімназіі ў Гомелі. З 1980 Саюз пісьменнікаў БССР прысуджае літаратурную прэмію імя Івана Мележа.